**Паданне аб Мастах**

Недзе тысячы паўтары гадоў назад па лясных і балотных нетрах прабіраўся на поўнач адзін са славянскіх радоў у пошуках новай радзімы. Быў ён невялікім, а таму больш мацнейшыя рады праганялі іх далей альбо давалі магчымасць перадахнуць некаторы час. А потым бясконцае падарожжа працягвалася далей. Але аднойчы, як яны лічылі, ім пашанцавала. Яны дабраліся да даволі вялікай ракі, ваколіцы якой ім вельмі спадабаліся. Па старым звычаям прыглядзелі яны ўжо і месца для селішча. Месца пад кожную хату добра гледзелі: ці не было тут раней дарогі, ці не знайшлося на гэтым месцы звярыных ці чалавечых касцей. А потым вяшчун роду прайшоў з рагулькаю лазы, каб праведаць, ці няма тут пад зямлёю рэчышча падземнага ручая. Увогуле ўсё добра праведалі. У гэтым родзе былі два хлапцы-двайняты. Ужо вусы ды барада пачалі прабівацца, але яшчэ былі не жанатыя. І імёны ў братоў былі звычайныя славянскія: Моста і Мосцень. Такі звычай быў, што двайняты павінны пры праходжанні абрада даросласці выбраць падобныя імёны.

Дык вось, адзін з хлапцоў, Моста, нейкі час не прымаў удзелу ў агульных справах. Ён усё нешта хадзіў і пільна ўглядаўся ў бліжэйшы хмызняк. Потым ціхенька адвёў у бок брата:

- Слухай, Мосцень, нешта мне не падабаецца вось той хмызняк. Здаецца, там хаваюцца людзі.

Не паверыў спачатку Мосцень, але звычай высочваць у лесе здабычу пераканаў яго ў тым, што Моста не памыліўся. Хаця хлапцы і былі асілкамі, ды й наогул людзі тады былі большыя і дужэйшыя, але засцерагчыся трэба было. Бо невядома, што гэта за людзі былі і ў якой колькасці. Паціхеньку хлапцы ўзброіліся самі і пераканалі ўзброіцца астатніх. Дзяцей і жанок сабралі ў сярэдзіну.

Калі невядомыя людзі пераканаліся, што іх выявілі, то яны з жудаснымі крыкамі акружылі славян і кінуліся ў бойку. Трэба сказаць, што былі яны ростам не меньшыя за славян, ды й не слабейшыя. І колькасна іх было куда болей.

Моста з Мосценем біліся ў першых радах. Ужо не адзін чужынец пакаціўся з прабітай галавою, але ворагаў, здаецца, меней не станавілася. Яны паціху, паціху прыціскалі славян да ракі. А рака была тут даволі шырокая. І плынь хутка несла некуды ў далечыню карчы ды рознае смецце. Ісці ж было некуды. За зброю ўзяліся жанчыны і падлеткі. Бойка ішла з пераменным поспехам. Тады славяне паскідалі з сябе кашулі - так яны рабілі заўсёды ў бітвах, калі гатаваліся да смерці. Быццам сілы прыбывалі тады ў славян, а ворага гэта палохала. І сапраўды, пачалі ворагі паціху падавацца назад. А потым раптам выйшлі з бойкі, але адыйшлі не надта далёка.

Славяне зразумелі, што чужынцы чакаюць дапамогу. Шкадавалі ўсе, што няма ніякай пераправы на другі бок ракі. Пераглянуліся Моста з Мосценем:

- Мы паспрабуем нешта зрабіць.

Крыху пагаманіўшы паміж сабой, хлапцы пачалі выконваць задуманае. Вывярнулі на гэтым беразе дзве здаравенныя сасны, звязалі вяршаліны і камлі паміж сабой. Узяўся Моста за адзін канец і пацягнуў дрэвы ў ваду. Зваленых дрэў якраз да сярэдзіны хапіла. А Мосцень перабраўся на другі бераг і зрабіў тое ж самае. Сталі браты на сярэдзіне спіной к спіне, камлі сасон на плячах трымаюць. Па гэтаму масту перш за ўсіх жанчыны з дзяцьмі пачалі перабірацца, потым падлеткі. Пакуль пераправа ішла, сцямнела. У поцемках сталі перабірацца і мужчыны – абаронцы. І вось ужо ўсе на другім беразе апынуліся.

Хлопцам бы пакідаць дрэвы і самім выбірацца, але ўжо моцна ўгрузлі іх ногі ў рачную твань. Паспрабавалі выцягнуць, але дзе там… Збіраліся хлапцы пакідаць у ваду дрэвы, але заўважылі, што па масту ціхенька пачалі перабірацца ворагі. Шапнуў Моста брату:

- Не спяшайся кідаць бярвенне! Няхай іх залезе болей, тады і скінем.

Так і зрабілі. Калі першыя ворагі амаль што падабраліся да берага, хлопцы разам скінулі з сябе бярвенні. Пачуліся крыкі чужынцаў, якія тапіліся ў рацэ. Багата іх было на мосце. Але і хлапцы за гэты час угрузлі ў вадзе па самую шыю.

Увесь род чакаў у непакоі хлапцоў усю ноч. Калі ўзышло сонца, то хлапцоў нідзе не было відаць. Цэлы дзень з напружаннем чакалі людзі, можа, вернуцца Моста з Мосценем. Пасылалі ўздоуж ракі маладых хлапцоў паглядзець. Але так і не знайшлі яны ні братоў, ні ворагаў. Хутчэй за ўсё патапіліся браты. Там на беразе па хлопцам прывялі трызну. Потым выбралі места пад селішча. Перш чым будавацца, месца тое абнеслі парканам у дзве чалавечыя постаці. А потым паўсталі і дамы. Селішча ж назвалі ў гонар братоў – Масты. Так яны называюцца і да гэтай пары.

*Спіс літаратуры:*

*1. Вінаградаў, Дз. Паданне аб Мастах / Дзмітрый Вінаградаў // Вінаградаў, Дз. Паданні даўніны сівой. – Мінск, 2020. – С. 26 – 28.*